Выстаўка «Наперадзе часу», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Айзека Азімава і Рэя Брэдберы, працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Як паведамляе БелТА, цэнтральнае месца ў экспазіцыі займаюць галоўныя творы пісьменнікаў-фантастаў. «Айзек Азімаў і Рэй Брэдберы — наватары, якія сталі класікамі і падарылі чытачам унікальны свет, таленавітыя прароцтвы і перасцярогі. Яны пачыналі ў эпоху, калі фантастыка была адной з разнавіднасцей таннага чытання, *pulp fiction*. Гэты жанр пасталеў разам з імі і стаў такім, якім мы яго ведаем і любім. У цэнтры ўвагі літаратурнай творчасці пісьменнікаў — сацыяльныя і духоўныя аспекты тэхнічнага развіцця, праблемы актыўнай дзейнасці чалавека ў сучасным свеце, барацьба супраць зла і пагрозы вайны», — расказалі арганізатары.